# Мовазнаўства

*В. М. КАРЧАГІНА*

## ПРЭФІКСАЛЬНА-ПАСТФІКСАЛЬНАЕ ЎТВАРЭННЕ ДЗЕЯСЛОВАЎ У СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

Многія зваротныя дзеясловы сучаснай беларускай мовы ўтвараюцца прэфіксальна-пастфіксальным спосабам. Разам з постфіксам -ся(-цца, -ца)[1] у састаў словаўтваральнага фарманта гэтых дзеясловаў уваходзяць прэфіксы а-, аб-/аба-, ад-/ада-, вы-, да-, за-, з-/-с-/са-, на-, па-, пера-, пра-, пры-, раз-/раза-/рас-, у-, уз-/ус-.

Як вядома, постфікс -ся ў спалучэннях з пераходнымі дзеясловамі абцяжараны граматычнай нагрузкай (адлюстроўвае значэнні непераходнае, ускосна-пераходнае і розныя значэнні сярэдне-зваротнага і залежнага станаў і выступае ва словаўтваральнай функцыі). Гэту функцыю ён набывае, далучыўшыся да дзеяслова адначасова з прыстаўкамі: *а-зірнуц-ца, а-ступіц-ца, аб-цярпец-ца, аба-знац-ца, ад-гукнуц-ца, ад-маўчац-ца, ада-спац-ца, вы-крычац-ца, вы-клюнуц-ца, да-жартавац-ца, да-плакац-ца, за-рапартавац-ца, з-гаварыц-ца, з-лайдачыц-ца, с-крычац-ца, са-званіц-ца, на-гасцявац-ца, на-сумавац-ца, па-плаціц-ца, па-пнуц-ца, пера-глянуц-ца, пера-мовіц-ца, пра-кашляц-ца, пра-чхац-ца, пры-вярзціся, пры-нюхац-ца, раз-бедавац-ца, рас-паўзці-ся, рас-шчабятац-ца, раза-чхац-ца, у-хітрыц-ца, уз-бушавац-ца, ус-хадзіц-ца* і інш. На трансфармацыі лексічных значэнняў такіх дзеясловаў адбіваецца граматычная мнагазначнасць (засяроджанасць дзеяння ў суб'екце) постфікса -ся. Таму ў іх могуць развіцца разнастайныя значэнні, якія звязаны з сярэдне-зваротным станам і не праяўляюцца ў аднакаранёвых дзеясловах без постфікса -ся: «сумеснасць дзеяння» *(згаварыцца, сазваніцца, змовіцца, зжыцца)*, якое адлюстроўвае ўзаемна-зваротнае станавае значэнне; «поўная задаволенасць суб'екта дзеяннем» *(наадпачывацца, набалявацца, нагасцявацца, нарагатацца, натанцавацца, насакатацца, нафіласофствавацца)*, у якім адлюстроўваецца ўскосна-зваротнае значэнне; «памылковасць або празмернасць дзеяння на шкоду суб'екту» *(пралгацца, праліčыцца, прагаварыцца)*, якое адлюстроўвае агульна-зваротнае значэнне; «паглыбленасць у дзеянне, крайняя вычарпанасць дзеяння» *(успацца, учытацца, упіцца, уляжацца, услухацца)*, якое адлюстроўвае агульна-зваротнае значэнне; «страта суб'ектам жадання да чаго-небудзь» *(прыцярпецца, прыесціся, прыглядзецца)*, звязанае са зваротна-пасіўным значэннем.

Тут постфікс -ся выступае як словаўтваральны сродак, без якога прыстаўкі не далучаюцца да пераважнай большасці гэтых дзеясловаў: спалучэнні тыпу *а-помніць, ад-маўчаць, ад-дыхаць, да-плаваць, да-сваволіць, с-крычаць, на-рагатаць, рас-кукаваць, рас-крычаць, расшумець* і да т. п. у сучаснай беларускай мове не ўжываюцца.

Далучыўшыся да прама-пераходных дзеясловаў, постфікс -ся, як правіла, мяняе ў іх значэнне пераходнасці: прамы аб'ект становіцца ўскосным ці ўвогуле ліквідуецца. У сучаснай беларускай мове сустракаюцца

вельмі рэдка зваротныя прама-пераходныя дзеясловы, напрыклад: у яго зімой *снегу не дапросішся* (Прымаўка). Мужчыны дзень пры дні выязджалі ў поле, бо *начакалася* зямля за зіму *плугоў* (К. Чорны). Ледзь *прычакайся* ... (Алёшка) ранняга вячэрняга *змроку* (М. Лынькоў).

У прэфіксальных дзеясловах, якія маюць пры сабе аб'ект дзеяння, развіваецца «ўскосна-вынікова-зваротнае» значэнне: *зачакацца каго-небудзь, закахацца ў каго-небудзь.* Дзеясловы, якія не маюць пры сабе аб'екта дзеяння, выражаюць вынікова-следчае значэнне: Як гатавала, дык *насмакавалася* (І. Шамякін. Крыніцы). Прычым у развіцці гэтых станавых значэнняў прымаюць удзел і прэфіксы [2]: без іх постфікс -ся выражаў бы ў такіх дзеясловах зусім іншыя станавыя значэнні: узаемназваротнае *(кахацца, грызціся),* залежна-зваротнае *(слухацца).*

Вялікая граматычная нагрузка постфікса -ся, напэўна, змяншае яго словаўтваральныя магчымасці і ўплывае на прадуктыўнасць усёй мадэлі «прэфікс — пераходны дзеяслоў — постфікс». Са 258 зафіксаваных намі зваротных дзеясловаў толькі 71 утвораны ад пераходных дзеясловаў прэфіксальна-пастфіксальным спосабам. Таму ў сучаснай беларускай мове пры ўтварэнні дзеясловаў такім спосабам большасць прыставак характарызуецца малапрадуктыўнасцю: а- *(апамятацца, апомніцца, ачуцца);* ад- *(адгукнуцца, адклікнуцца, адкрышталізавацца);* пра- *(пралічыцца, прагаварыцца);* пры- *(прывярзціся, прынюхацца, прыесціся, прыцярпецца);* пера- *(перамовіцца, перасвіснуцца);* у- *(упіцца, услухацца, учытацца).*

Прадуктыўнымі з'яўляюцца прыстаўкі аб-/аба- *(абажрацца, абжэрціся, абазнацца, абассацца, абвапнавацца, абзавесціся, абмовіцца, абцярпецца);* *да- (дабудзіцца, даведацца, дагукацца, дакрычацца, дамяняцца, дапамінацца, дапрасіцца, дасвяткавацца, даткнуцца, дашукацца);* на- *(нагарлапаніцца, нагарланіцца, наглядзецца, накайтацца, наклюнуцца, наклявацца, нанюхацца, насвяткавацца, насёрбацца, насудзіцца, натанцавацца, нахлёбацца, нахлябтацца, нацярпецца);* раз-/рас- *(разалгацца, разачхацца, разбубніцца, разгарлапаніцца, разлапатацца, раскрычацца, расплаціцца, растанцавацца, расчыркнуцца, расшчабятацца, расчырыкацца).*

Як словаўтваральны постфікс -ся сумесна з прэфіксамі часцей выступае ў непераходных дзеясловах (са 258 прэфіксальна-пастфіксальных дзеясловаў матывуюцца непераходнымі 187) *азірнуцца, аступіцца, адбрахацца, аджартавацца, адмайчацца, адфыркнуцца, выбегацца, дагандлявацца, далгацца, даплавацца, дарагатацца, дазваніцца, заляжацца, задыхацца, зачакацца, збедавацца, згаварыцца, нагаласіцца, нагалёкацца, нагыркацца, накамандавацца, намайчацца, напакутавацца, напанавацца, насакатацца, наслужыцца, нафіласофствавацца, напомсціцца, пераглянуцца, прымудрыцца, разбожкацца, разбрысціся, разбурчацца, разбуяніцца, разгаласіцца, разгудзецца, разгутарыцца, раз'енчыцца, размітынгавацца, разнюніцца, разрумзацца, расфантазіравацца, расхандрыцца, расхварэцца, расхлусіцца, расшаркацца, расшумецца, расшчабятацца, улегчыся, успацца, усхадзіцца* і г. д., дзе ён не абцяжараны граматычнай нагрузкай, г. зн. не з'яўляецца спецыяльным паказчыкам значэння непераходнасці і не можа праяўляць станавыя значэнні ў дзеясловах, якія не маюць катэгорыі стану.

Здольнасць постфікса -ся ўзмацняць значэнне засяроджанасці дзеяння ў суб'екце ў непераходных дзеясловах адлюстроўваецца на развіцці такіх прэфіксальных значэнняў, якія не праяўляюцца ў аднакаранёвых бяспостфіксных утварэннях, а іменна: 'насычанасць суб'екта дзеяннем' *(нагаладацца, надурэцца, намайчацца, напанавацца, нарайціся, настагнацца, насумавацца, нахварэцца);* 'пазбавіцца, ухіліцца ад каго-небудзь з дапамогай дзеяння, названага ўтваральным словам' *(аджартавацца, адмайчацца, адфыркнуцца, адбрахацца, адгыркнуцца);* 'дасягнуць вялікай інтэнсіўнасці ў ажыццяўленні дзеяння, названага ўтваральным словам' *(разачхацца, разбедавацца, разбушавацца, разбуяніцца, разваявац-*

*ца, развохкацца, разгутарыцца, раззвінецца, раскіпецца, раскукавацца, расп'янстваваццa, расскакацца, расхлусіцца).*

Прэфіксы ў гэтых дзеясловах выступаюць як асноўныя выразнікі новых лексічных значэнняў. У шэрагу выпадкаў, калі патрабуецца раскрыць лексічнае значэнне дзеяслова ў аб'екце, яны садзейнічаюць выражэнню ўскоснай пераходнасці (*ужыцца ў ролю, дасядзецца да пеўняў, разжыцца на грошы*).

У сучаснай беларускай мове прадуктыўнымі з'яўляюцца ўтварэнні з прыстаўкамі раз-/рас-/ (*раскапрызіцца, разбожкацца, разбрысціся, разбуркацца, развaжнічацца, разгаласіцца, разгаманіцца, разгаўкацца, разгудзецца, раз'енчыцца, разладзіцца, разныцца, разрохкацца, расхаркацца, раскудахтацца, распазяхацца, распішчацца, расхрапціся*); ад- (*адвісецца, аджартавацца, адмаўчацца, адфыркацца, адбрахацца, адбегацца, аддыхацца*); да- (*дабегацца, дагандлявацца, дакрычацца, даплавацца, даплакацца, дасваволіцца, дасвістацца*); з-/с- (*збедавацца, згаварыцца, здыхацца, злайдачыцца, зляжацца, зжыцца, скрычацца, скапыціцца, ссесціся*).

Да малапрадуктыўных адносяцца ўтварэнні з прэфіксамі а- (*азірнуцца, аступіцца*); вы- (*выбегацца, выплакацца, выспацца*); за- (*залгацца, заляжацца, задыхацца, зарапартавацца*); у- (*ухітрыцца, улегчыся, усесціся, успацца*); па- (*папнуцца, паплаціцца*); пера- (*перасвіснуцца*); пры- (*прыглянуцца, прыесціся*).

Прэфіксальна-пастфіксальны спосаб выяўляе найбольшую прадуктыўнасць непераходных дзеясловаў. А ў некаторых жа выпадках утварэнне зваротных дзеясловаў з удзелам таго ці іншага прэфікса наогул магчыма толькі ад непераходных дзеясловаў. У гэтым якраз і заключаецца адрозненне постфікса -ся, што ўжываецца ў ролі словаўтваральнага элемента сумесна з прыстаўкамі, ад функцыі яго як самастойнага словаўтваральнага элемента, бо ў апошнім выпадку -ся далучаецца да пераходных дзеясловаў. Тлумачыцца гэта тым, што постфікс -ся, які некалі ўяўляў сабою форму вінавальнага склону займенніка, аглюцініраваўся ў першую чаргу з пераходнымі дзеясловамі. Для ўтварэння вытворных ад непераходных дзеясловаў постфікс -ся стаў выкарыстоўвацца сумесна з прыстаўкамі. Адбылося гэта, напэўна, пазней, тады, калі за дадзеным постфіксам замацавалася роля словаўтваральнага элемента. Прэфіксальна-пастфіксальныя дзеясловы непераходныя і адносяцца да закончанага трывання.

[1] У далейшым будзем прыводзіць з магчымых морфаў толькі -ся.

[2] Некаторыя значэнні прэфіксаў раскрываюцца толькі ў дзеясловах, якія маюць пры сабе аб'ект дзеяння — прамы ці ўскосны (*угрызціся ў зямлю, закахацца ў каго-небудзь*).

*Е. Г. ТАРАСЕВИЧ*

## ИМЕНА СУЩЕСТВИТЕЛЬНЫЕ С РАЗНООФОРМЛЕННЫМИ ПО ЧИСЛУ ЛЕКСИКО-СЕМАНТИЧЕСКИМИ ВАРИАНТАМИ В РУССКОМ И БЕЛОРУССКОМ ЯЗЫКАХ

Как известно, «семантика неисчисляемости и как итог отсутствующая или неполная возможность числового параллелизма обнаруживается не только в сфере отдельного слова, но и в сфере значений одного слова»[1]. Для описания специфики отношения таких слов к грамматической категории числа удобно воспользоваться терминами П. А. Соболевой, предложившей называть имена существительные, все лексико-семантические варианты (далее — ЛСВ), которые ведут себя одинаково по отношению к формам числа, гомогенными, а имена существительные, ЛСВ которых получают различное числовое оформление, гетерогенными; «у гомогенных существительных все ЛСВ либо коррелируют по числу, либо одинаково не коррелируют», а «у гетерогенных слов одни ЛСВ коррелируют по